# ПАДАРУНАК АД ДУШЫ

На пачатку снежня студэнты-валанцёры філалагічнага факультэта нашага ўніверсітэта, сярод якіх і аўтар матэрыяла, у рамках Тыдня студсавета факультэта наведалі Віцебскі дом-інтэрнат для састарэлых і інвалідаў. Для яго жыхароў у якасці падарунка мы падрыхтавалі невялічкую канцэртную праграму з вершамі, песнямі і танцамі. Сцэнарыстам выступіла трэцякурсніца Ірына Мікуцкая.

Прыемна, што ў доме-інтэрнаце нас сустрэлі як родных. У зале панавала цёплая святочная атмасфера, і выступаць нам было толькі за радасць. Кожнага студэнта, які выходзіў на сцэну, жыхары інтэрната сустракалі шчырымі апладысментамі. А мы, у сваю чаргу, імкнуліся зрабіць усё, каб іх парадаваць.

Трэцякурсніца Дар'я Прыгожая і аўтар матэрыяла выканалі вядомыя песні «А за окном то снег, то дождь» і «А он мне нравится», а студэнтка трэцяга курса Наталля Тарарышкіна выступіла з кампазіцыяй «Соловейка».

Вершы «Здароў, марозны, звонкі вечар!» паэта Максіма Багдановіча і «Люблю зіму» Генадзя Бураўкіна выразна і эмацыянальна прачыталі студэнтка другога курса Юлія Рудзякова і пяцікурсніца Галя Брахун, а другакурсніца Ірына Радзіхоўская прадставіла на суд гледачоў верш уласнага сачынення «Казка».

Даспадобы прыйшоўся жыхарам інтэрната і танец «Валенки» трэцякурсніц Вольгі Зязюлі і Яны Цывіс.

Пасля святочнага канцэрта мы ўручылі нашым гледачам падрыхтаваныя загадзя салодкія падарункі. Спадзяёмся, у гэты вечар жыхары інтэрната змаглі хоць на імгненне адчуць сябе дзецьмі, якія чакаюць сапраўднага цуду. І вось ён адбываецца… А для нас самым галоўным падарункам былі шчырыя ўсмешкі і слёзы шчасця тых, хто, на вялікі жаль, навагоднія святы сустрэне без родных і блізкіх.

**Надзея РАДЗЕЎСКАЯ,**
**студэнтка 1 курса ФлФ.**